# Роднае слова

ISSN 0234-1360



10
2001

# Змест


**Шавыркін Міхась.** Настаўнік — Грамада — Будучыня . . . 3

**ФІЛАЛОГІЯ**

**Макарэвіч Васіль.** Пад сяміколернай вясёлкай: Нататкі пра жыццё і творчасць Уладзіміра Верамейчыка . . . 4
**Верамейчык Уладзімір.** Калінавы водсвет: Вершы . . . 8
**Барабанішчыкава Таццяна.** Праблема міфалагізму ў сучаснай беларускай літаратуры . . . 11
**Гетман Ігар.** Заходнебеларуская літаратура ў даследаваннях першай паловы 1990-х гадоў: Працы Уладзіміра Калесніка ў кантэксце гісторыка-літаратурнай думкі пачатку 90-х гадоў . . . 13
**Яршоў Ігар.** Ля вытокаў мемуарнага жанру: Лісты Філона Кміты-Чарнабыльскага . . . 16
**Ткачова Паўліна.** Байка ці апавяданне?: Творчасць Ядвігіна Ш. 1911 — 1913 гг. . . . 18
**Ядвігін Ш.** Чалавек. Васількі . . . 20
**Мархель Уладзімір.** Ад "Запаведзі" да "Запавету": Перастварэнні верша Тараса Шаўчэнкі "Заповіт" . . . 21
**Садаўнічы Эдуард.** Рамантызм у кантэксце гісторыі сусветнай літаратуры (*працяг*) . . . 24
**Запрудскі Сяргей.** Асоба і час: Развагі да 90-годдзя з дня нараджэння Міколы Лобана . . . 27
**Бадзевіч Зінаіда.** Фармальна-семантычная арганізацыя ад'ектываў з прэфіксамі лацінскага паходжання . . . 31
**Прыгодзіч Мікалай.** Усе дарогі — ад парога: Слова пра Уладзіміра Карпава . . . 34
**Карпаў Уладзімір.** Тры эцюды: Эцюд пра сіметрыю . . . 35
**Кулеш Ганна.** Пра ўжыванне слова ***жорсткі*** і блізказначных з ім . . . 38
**Басава Ганна.** "Ні сюды Мікіта ні туды Мікіта": Уласнае імя як носьбіт нацыянальна-культурнага кампанента значэння слова . . . 40
**Гапоненка Ірына.** Беларускі іменаслоў перыяду першага беларускага адраджэння: Каталіцкія і праваслаўныя імёны . . . 42
**Даніловіч Мікола.** "Супраць ліха на ўзгорачку дзе пень на калоду брэша": Канструкцыйна-колькасныя фразеалагічныя дыялектызмы . . . 45
**Кошчанка Уладзімір.** Яблык — яблыня: З гісторыі слоў . . . 49

**МЕТОДЫКА І ВОПЫТ**

**Маляўка Пётр.** Паглыблены мастацкі аналіз драмы "Радавыя" Аляксея Дударава на ўроках літаратуры . . . 52
**Герцык Аляксандр.** Біблейскія казанні. V клас. . . 57
**Грыцаль Таццяна.** Вывучэнне паэмы Рыгора Барадуліна "Вяртанне ў першы снег" у IX класе . . . 59
**Навумчык Мікалай.** Тэставы кантроль пры вывучэнні ў VII класе апавядання Віктара Карамазава "Дзяльба кабанчыка" . . . 63
**Лаўрэль Яўген.** Зразумець мастацкі твор: Аналіз напісання водгукаў . . . 65
**Пачаповіч Валянціна.** Сродкі моўнага эмацыйнага ўзбагачэння . . . 69
**Красней Віктар.** Семантычная характарыстыка слова . . . 73
**Федарцова Кацярына.** Вывучэнне і засваенне літаратурных нормаў ва ўзаемасувязі з дыялектнай мовай: Правапіс прыстаўнога [в] . . . 77

**КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК**

**Кандрацьеў Віталь.** Скарбы роднага краю: Конкурс эрудытаў (VI — VII класы) . . . 79
**Пажэмяцкас Галіна.** Чалавек на сваёй зямлі: "Свая гульня". VII — VIII класы . . . 82

**МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ**

**Хмяльніцкі Мікалай.** Нацыянальна-гістарычныя асаблівасці польскага рамантызму . . . 84

**НА РОСТАНЯХ**

**Фаменка Тамара.** Яшчэ раз пра Алеся Белакоза . . . 93
**Мархель Уладзімір.** Перад памяццю Зосі Манькоўскай . . . 95
**Абрамовіч Павел.** Літаратурна-мастацкая крытыка ў "Нашай Ніве": Праблемы, крытэрыі, жанры . . . 97
**Салавей Лія.** Калыска і калыханка ў беларусаў . . . 99
**Кастусь Цыбульскі.** "Я жыву, як усе...": Песні . . 105
**Цыркун Канстанцін.** Над намі — неба: Планета Нептун. Сузор'е Валасы Веранікі . . . 108

***Лінгвістычная мазаіка. Лепешаў Іван.*** Чаму мы так гаворым (33, 44, 48, 76). *Сцяцко Павел.* Паслухаем мовазнаўцаў (39, 83).
***Паэтычная старонка. Верамейчык У.*** "Я іду у блакітнае ранне жыцця...". Каралева Палесся. Трэскі. Сэрца. Грузінка. Родны дом. "Снягі, снягі... На Прыпяці снягі...". Навальніца. "Я ў дзесяць год...". "Мы звалі фізіка Кулонам...". "Не буду піць ларыйскага віна...". Калінавы водсвет. Сталасць. Жаданне. Клянуся Прыпяццю. "Жылося добра мне на свеце гэтым...". Прыпяць (8). *Ходзька А.* Маліны (пер. *Шніп В.*). *Барычэўскі Я.* Рыбак (пер. *Чыгрын І.*). *Зан Т.* Вязень (пер. *Міклашэўскі Я.*). *Лада-Заблоцкі Т.* Вілія (пер. *Мархель У.*). *Міцкевіч А.* Ода да маладосці (пер. *Вялюгін А., Дзяргай С.*). *Сыракомля У.* Бусел (пер. *Лучына Я.*). *Чачот Я.* Праснічка (пер. *Цвірка К.*). *Норвід Ц.* Самота. "Дай стужку мне — яе вярну без смутку...". Над труною Юліі Капулеці ў Вероне (пер. *Мінкін А.*) (88). *Адам М-скі (Манькоўская З.).* Ціхая. У лодцы. Калыханка. Доля (пер. *Мархель У.*) (95).
***Літаратурны ветразь. Чарняк І.*** Замалёўка. Аксамітная раніца. Мой белы ад рамонкаў край. Словы. Паэзія (103). *Бабарыка Г.* Палыновы сум. Восеньскае. Роздум. Жураўлі (104).
***І песню родную люблю я...*** Песні на вершы *К. Цыбульскага*: Апошні дзень лета (муз. *Э. Зарыцкага*). (51).Зямля бацькоў (муз. *В. Іванова*). Бацькоўскі зруб (муз. *В. Іванова*). Зязюля-варажбітка (верш і муз. *К. Цыбульскага*). Месяц і вішанька (муз. *М. Алешкі*). Браток-сусед (муз. *М. Яцкова*) (105).
**Саламевіч Янка.** Каляндар памятных датаў і юбілейных дзён на 2001 г.: Лістапад (78).
**Даведкі** (56, 68, 81,112).



**У адпаведнасці з Законам аб друку аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных у артыкуле фактаў і звестак. Рэдакцыя пакідае за сабой права друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.**

*Прапануем план-канспект*

Таццяна ГРЫЦАЛЬ

# ВЫВУЧЭННЕ ПАЭМЫ РЫГОРА БАРАДУЛІНА “ВЯРТАННЕ Ў ПЕРШЫ СНЕГ” У IX КЛАСЕ

**Мэта:** удасканальваць навыкі ідэйна-эстэтычнага аналізу мастацкага твора, развіваць эстэтычны густ вучняў праз разуменне паэтыкі твора, развіваць пачуццё любові да бацькаўшчыны.

**Форма ўрока:** урок-даслед ідэйна-мастацкіх вартасцяў твора.

**Абсталяванне:** грамзапіс песні на верш Р. Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” (кампазітар Ігар Лучанок), партрэт паэта, ілюстрацыі школьнікаў да навучальнай тэмы.

**Эпіграф:**

*Каб ведаць паэта,*
*Трэба пабываць на ягонай зямлі*
*І паэтаву маці пабачыць.*

Р. Барадулін. Агаворка.

**Ход урока.**

Настаўнік. Барадулінская паэзія — светлая, як чэрвеньскі ранак, празрыстая, як дзіцячая сляза, чароўная, як пошум лесу, гнеўная, як гром перуна, — не раз кранала нашу душу. Сёння мы яшчэ раз дакранёмся сэрцам да паэтычных радкоў Рыгора Барадуліна, бліжэй пазнаёмімся з яго творчасцю: паспрабуем асэнсаваць паэму “Вяртанне ў першы снег”, дзе паэт прапануе завочна “пабываць на яго зямлі”, бацькаўшчыне, і высветліць складаныя маральныя пытанні сучаснасці. Наша задача — правесці прэзентацыю твора, даследаваць яго ідэйна-эстэтычныя вартасці. У час працы спынімся на наступных пытаннях:

1. Актуальнасць тэмы, раскрытай у паэме.
2. Чалавеказнаўчая напоўненасць твора.
3. Паэтыка твора ў адзінстве з ідэяй:
   а) жанравыя асаблівасці;
   б) сюжэт;
   в) кампазіцыя;
   г) памер твора і глыбіня яго зместу;
   д) часавая прастора і месца дзеяння;
   е) мова твора; ацэначная функцыя слова.
4. Асоба аўтара і аўтарская пазіцыя.



*Таццяна Міхайлаўна Грыцаль — старшы выкладчык беларускай мовы і літаратуры Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі (філіялу г. Баранавічы). Аспірантка лабараторыі літаратурнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі. Закончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка (1996).*

● *Спачатку давайце высветлім, як чытаецца твор.*

Лёгка, з асалодай, быццам пабывалі на радзіме паэта, кранае мова твора, яго мілагучнасць і г. д.

Настаўнік. Так, правільна вы адзначылі, што, чытаючы твор, быццам пабывалі на радзіме паэта, на Ушаччыне. Сам Р. Барадулін піша:

Каб ведаць паэта,
Трэба пабываць на ягонай зямлі
І паэтаву маці пабачыць.

Значыць, гэтая паэма — ключ да душы паэта і яго творчасці, змястоўнай, па-філасофску абагульненай.

● *Працу над творам пачнём з асэнсавання загалоўка. Як вы зразумелі яго сэнс?*

Назва паэмы метафарычная. Вяртанне ў першы снег — вяртанне дамоў, на радзіму, да маці, роднага кута. Першы снег — увасабленне чагосьці чыстага, некранутага, найбольш запамінальнага, уражальнага.

● *Што выяўлена ў назве твора: тэма ці асноўная думка?*

Тэма, бо прадмет гутаркі ў творы — вяртанне да родных вытокаў, да духоўнага неруша.

● *Ці актуальная тэма?*

Так, актуальная, яна вырашаецца ў творчасці практычна ўсіх паэтаў, напрыклад, у Якуба Коласа (“Новая зямля”), Ніла Гілевіча (раман “Родныя дзеці”, “Лагойшчына мая”) і інш. Тэма актуальная, бо вечная. Радзіма — пачатак усіх пачаткаў лёсу чалавека, выток духоўнасці. На жаль, сёння многія забываюцца на гэтае і часта дома бываюць толькі гасцямі.

Настаўнік. Актуальнасць абранай тэмы і праблемы і ёсць адна з вартасцяў твора. Вядома, што літаратура — гэта чалавеказнаўства, кожны твор змяшчае інфармацыю пра духоўны вопыт чалавецтва. Не выключэнне і паэзія Р. Барадуліна, глыбока духоўная па сваім змесце і выразна нацыянальная па форме. Хто ж ён, чалавек, у паэме Р. Барадуліна?

Лірычны герой, як і іншыя персанажы твора, глыбока духоўны чалавек, які не страціў сумлення і адчувае адказнасць за многае, што адбываецца навокал. Ён беларус. Увогуле, беларус не толькі лірычны герой, гэта і маці, і бацька, і “нядзеля”, і сябры, і нават багі. У іх увасоблена ўсё высакароднае, духоўнае, прыгожае.

Глыбока спасцігнуць чалавеказнаўчую напоўненасць паэзіі Р. Барадуліна немагчыма без разумення паэтыкі твора — спосабаў і сродкаў адлюстравання рэчаіснасці.

● *Паспрабуем раскрыць магчымасці паэтыкі ў выяўленні ідэі твора. Найперш звернемся да жанру. Вызначце яго асаблівасці.*

"Вяртанне ў першы снег" — паэма, якую можна вызначыць як твор ліра-эпічнага характару. Яна багатая на пачуцці, увага канцэнтруецца на ўнутраным свеце лірычнага героя. Па стылёвых асаблівасцях паэму можна назваць рамантычна-рэалістычнай.

● *Якія прыкметы рамантычнага і рэалістычнага характару вы заўважылі ў творы?*

Вяртанне лірычнага героя ў мінуўшчыну, як, напрыклад, у паэме Янкі Купалы "Курган", зварот да фальклору, акцэнтаванне ўвагі на ўнутраным стане героя надаюць паэме выразна рамантычны характар. Аднак паэма насычаная канкрэтным жыццёвым матэрыялам, паўсядзённа-побытавымі малюнкамі, рэальнымі карцінамі жыцця беларусаў, што набліжае твор да рэалізму.

● *Што можна сказаць пра сюжэт у лірычным творы і, у прыватнасці, пра сюжэт прапанаванай паэмы?*

Спецыфіка паэзіі, у адрозненне ад прозы, у тым, што яна пазбягае падрабязнага апісання падзей, дзеянняў, учынкаў, апавядае пра глыбокія перажыванні, выкліканыя гэтымі падзеямі, імкнецца да ўзвышанага, філасофскага асэнсавання жыцця. Таму ў лірыцы звычайна сюжэт акрэслены слаба або зусім адсутнічае. Не выключэнне і ліра-эпічная паэма "Вяртанне ў першы снег". Гэта слабасюжэтны твор. У ім няма актывізацыі дзеянняў, учынкаў, няма, на першы погляд, канфлікту, супярэчнасцяў, што звычайна з'яўляецца асновай сюжэта. Але гэта толькі на першы погляд, калі ўчытаешся, то зразумееш, што аснова твора — своеасаблівы канфлікт на ўзроўні свядомасці паміж духоўнасцю і бездухоўнасцю, які вырашаецца на карысць першага. Яскравая адзнака сюжэта ў гэтым лірычным творы — напружаная думка пра значэнне роднага кута ў жыцці чалавека. Запаволенасць і слабасюжэтнасць барадулінскай лірыкі апраўданая, бо дае магчымасць паразважаць над тым, што для чалавека значыць радзіма. Але ў паэтычных творах сюжэт можа быць і больш акрэслены, актыўны, як, напрыклад, у рамане Н. Гілевіча "Родныя дзеці".

● *Звярніцеся, калі ласка, да кампазіцыі твора і адзначце яе спецыфіку ў паэме.*

"Вяртанне ў першы снег" складаецца з васьмі частак, зладжаных, зітаваных у адно сэнсавае цэлае. Кожная наступная частка — удалы працяг папярэдняй. Так, спачатку мы разам з лірычным героем ляцім у самалёце, потым едзем у прыгарадным перапоўненым аўтобусе, бачым "нядзелю", пасля — матчыну хату і г. д. Кожная паэтычная замалёўка дапаўняе вясковыя краявіды, побыт і паглыбляе думкі пра родную зямлю. Апошняя частка лагічна завяршае папярэднія, канцэнтруе ідэю твора.

● *Паспрабуйце ахарактарызаваць часавую прастору ў творы і месца дзеяння.*

Час у паэме "плыве". Ён не пульсуе, не напружаны. Толькі адзін эпізод у часавым вымярэнні сціснуты — час бяжыць, калі "лётчык не можа прыпомніць... / Стрэлка нервова дрыжыць. / Б'ецца жылка на скроні часта...".

У гэтым эпізодзе час скандэнсаваны, ён хуткаплынны, імпульсіўны. Такі прыём канцэнтравання часавай прасторы (стрэлка гадзінніка адлічвае напружаныя, часам апошнія хвіліны жыцця) тыповы ў літаратуры. Ён ужываецца для актывізацыі думак і пачуццяў чытача. Прыгадаем паэму Аркадзя Куляшова "Сцяг брыгады", дзе гадзіннік адлічвае час перамогі.

У цэлым паэма Р. Барадуліна часава запаволеная, спакойная, і гэта апраўдана, бо дазваляе нам, чытачам, не спяшаючыся паглыбіцца ў сферу пачуццяў, паразважаць пра беларускую зямлю і людзей, што жывуць на ёй, пра сваё месца ў бацькаўшчыне і ў свеце.

Месца дзеяння — радзіма лірычнага героя, на якой адбываюцца падзеі агульначалавечай значнасці. Забудзем сваю радзіму — страцім духоўнасць, сябе, сваю зямлю.

● *Вызначце памер твора і суаднясіце яго з глыбінёй зместу.*

Паэма па памеры невялікая. Часткі напісаны амфібрахіем (трохскладовай стапой з націскам на другім складзе). Некаторыя радкі не маюць строгай рытмічнай арганізацыі. Кожнае слова ёмістае, значнае, мае глыбокі сэнс, абвастрае перажыванні чытача.

● *Звернемся да ідэйнага зместу і мастацкай вартасці асобных частак твора.*

У першай частцы бачым лірычнага героя, закладочанага тым, што драбнее беларуская зямля. Ён — "дзівак", бо неабыякавы да лёсу родных мясцін, радуецца сустрэчы з імі, вітаецца, як з чалавекам. Горда гучыць гэты зварот:

"Дзень добры, Полацк,
паклон, зямляча!".

Полацк — радзіма героя, "зямляча", але з падтэксту паўстае сімвал бацькаўшчыны, Беларусі, зварот да гістарычнай мінуўшчыны, калі побач з Кіевам існавала другое магутнае княства — Полацкае.

Але не ўсе беларусы — "дзівакі" з абвостраным пачуццем адказнасці.

У першай частцы паэтызуецца побыт вёскі, і гэта яшчэ адно сведчанне лірычна-рамантычнага характару твора. Родная хата ўспрымаецца як сімвал духоўнасці; кошка побач з гаспадыняй — як абярэг ад усяго ліхога (прыгадаем, што ў славянскай міфалогіі каты дапамагалі людзям перамагчы злыя сілы).

● *Знайдзіце ў дадзенай частцы паэмы наватворы, аўтарскія словы, паспрабуйце растлумачыць іх лексічнае значэнне.*

"Пазаснягаў" дол — аказіяналізм і г. д.

● *Параўнайце танальнасць гэтай і наступнай частак паэмы.*

Другая частка паводле танальнасці адрозніваецца ад папярэдняй. Перад чытачом — перапоўнены, людны, "вясёлы глобус", бойкі бальшак. Маленькі прыгарадны перапоўнены аўтобус "плыве" па беларускіх абшарах, качаецца на выбоінах. Ён успрымаецца як самастойны вобраз, у некаторай ступені нават персаніфікаваны.

● *Аўтобус, як Ноеў каўчэг — сустракаем такое параўнанне ў тэксце. Успомніце біблейскую ле-*

*генду пра Ноеў каўчэг. Чаму, на вашу думку, паэт ужывае такое параўнанне?*

Магчыма, паэт хацеў падкрэсліць, што менавіта гэты вясковы аўтобус і ёсць той найбольш некрануты пласт беларускай духоўнасці, што забяспечыць маральнае выратаванне нацыі, таму ўспрымаецца гэты вобраз сімвалічна, але разам з тым ён вельмі рэалістычны: памяркоўны шафёр (тыповы беларус), ветлівыя пасажыры, "нядзеля", калі падводзяцца рахункі працы мінулага тыдня.

Трэцяя частка ў большай ступені навявае філасофскія і лірычныя думкі, перажыванні.

● *Ці згодныя вы з тым, што ў гэтай частцы найбольш поўна раскрытая назва паэмы?*

Ключавым выслоўем да разумення ідэйнага зместу можа стаць выслоўе "незаследжаны двор" — знак духоўнай чысціні. Увага акцэнтуецца на глыбокіх унутраных перажываннях. Рэальнасць успрымаецца як цудоўны сон, які не дай бог парушыць. У тэксце хісткая мяжа паміж сном і явою: дзіцячае жыццё — цудоўны сон дарослага, жыццё дарослага — цудоўны сон дзіцяці.

Адзін з найбольш запамінальных вобразаў у гэтай частцы — парог вясковай хаты. У народных традыцыях і ўяўленнях ён звязваецца з мяжой паміж чым-небудзь, з пераходам у іншы стан. За парогам хочацца пакінуць усё дрэннае і пераступіць яго з чыстай душой.

Аднак галоўная думка ў гэтай частцы, як і ва ўсёй паэме, — неруш духоўнай чысціні, "першы снег", да якога трэба вярнуцца, назва паэмы рэалізуецца тут найбольш поўна. Варта супаставіць радкі з апошняй часткі паэмы:

У першым снезе маім...
Ані следу здрады, хлусні,
Ні слізгот, ні заносу, ні стромы —
На незаследжаным снезе.

"Вяртанне ў першы снег" — вяртанне да духоўнага неруша, дзе няма месца здрадзе, хлусні, дзе падтрымаюць у час жыццёвых слізгот і заносаў, дзе дапамогуць пераадолець жыццёвыя кручы.

У чацвёртай частцы (больш рэалістычнай па змесце, чым папярэдняя) апісваецца вясковае сняданне.

● *Параўнайце апісанні сняданя ў "Новай зямлі" Я. Коласа і ў паэме Р. Барадуліна.*

Сняданне ў Р. Барадуліна — не канкрэтная карціна, як, напрыклад, у "Новай зямлі" Я. Коласа, а штуршок для светлых успамінаў. Для паэта важнае не канкрэтнае бытаапісанне, а факт асэнсавання ўрачыстай, няхай і пабытавай з'явы, у якой свая паэзія, харэство. У гэтым выяўляецца спецыфіка лірыкі і стылёвая асаблівасць творчасці паэта.

● *Р. Барадулін паэтызуе простыя вясковыя карціны, напрыклад, яблыньку, што расце пад акном, параўноўвае яе з дзяўчынай. З якой мэтай аўтар ужывае дадзены паралелізм?*

Такі мастацкі троп (паралелізм) характэрны для фальклору, і тое, што аўтар звяртаецца да яго, падкрэслівае рамантычны характар паэмы. Яблынька ўвасабляе гуманнасць, духоўнасць і ісціннасць. Лірычны герой успамінае яе гарадскую сяброўку.

Вучань зачытвае свой водгук на радкі паэмы:

Першы снег
          на самотную падаў.
Стаяла сярод будынін блочных
На месцы
          былога саду,
На месцы
          будучай плошчы.
Вецер зубамі ляскаў.
Не магла зразумець адразу,
Ці ёй зрабілі ласку,
Ці пакінулі на абразу?..

Паэзія Р. Барадуліна мяне заўсёды ўзрушвае і кранае сваёй лірычнасцю і глыбінёй. Не выключэнне і паэма "Вяртанне ў першы снег". У кожным радку — глыбокая думка, над якой хопіць разважанняў не на адну старонку, таму што паэт закранае шмат праблемаў, вельмі актуальных сёння. Праблема, якая пастаўлена ў гэтых радках, — чалавек і яго ўзаемадзеянне з прыродай, вынікі дзейнасці чалавека — вырашаецца праз падтэкст.

Цяпер ужо многія людзі адчулі небяспеку для прыроды наступстваў цывілізацыі, і найперш паэты. Таму Р. Барадулін звяртаецца да праблемы "былога саду". Сад, на маю думку, — гэта сімвал духоўнасці, гуманнасці, ісціннасці. Нездарма ён ахарактарызаваны эпітэтам "былы", гэта значыць высечаны. Грамадства паступова губляе, "высякае" сваю гуманнасць разам з высечаным садам. Увогуле, тэма высечанага саду часта сустракаецца ў класічнай літаратуры. Прыгадаем "Вішнёвы сад" Антона Чэхава, "Хроніку дзетдомаўскага саду" Віктара Казько.

У Рыгора Барадуліна ад саду засталася толькі адна яблынька, адзінокая сірацінка, якая страціла сваіх "гордых суседак". Яна, яблынька, займае няпэўнае становішча паміж мінуўшчынай і будучыняй. Мінуўшчына — сад, будучыня — плошча. На плошчы няма месца саду, таму яблынька адчувае сябе тут няўтульна, не можа зразумець: яе існаванне тут, на плошчы, гэта што — "ласка людская ці абраза". Як бы там ні было, а адчувае яна сябе няпэўна, "сярод будынін блочных" няма ёй месца. Шматкроп'е ў канцы радка дае прастор для разважанняў. Мне здаецца, яблынька зразумела, што гэта, хутчэй, абраза, насмешка, чым літасць чалавека.

У гэтых радках вельмі адчувальны непакой паэта за лёс не толькі сваёй радзімы, а ўсяго чалавецтва. Сэнс жыцця ў тым, каб пасадзіць дрэва, а калі яго высякаюць, гэта азначае нешта адваротнае — духоўную дэградацыю. Чалавек не заўсёды адказвае за свае ўчынкі, не хоча прадбачыць, якія вынікі будзе мець яго дзейнасць. Безразважнасць чалавека дае права "думаць" і "разважаць" яблыньцы. Гэта персаніфікаваны, ажыўлены вобраз. Яна, жывая і ні ў чым не павінная, пакінутая на пагібель, хоць вонкава гэта выглядае як ласка людская. Яблынька аказалася незапатрабаваная

чалавекам (“пакінулі на абразу”). Таму самотна не толькі яблынькцы, але і чытачу.

Дзе сад, там чалавек, дзе блочная будыніна, там плошча. Сад і плошча ў радках Р. Барадуліна выступаюць як кантэкстуальныя антонімы. Сад і плошча — гэта, на маю думку, алегарычныя вобразы прыроды і цывілізацыі, якія рэзка супрацьпастаўленыя ў жыцці, асабліва ў апошні час. Цікава, што ў вялікім садзе не адчуваеш сябе безабаронным, а вось на плошчы, перад тварам веліччэзных будынін, чалавек выглядае мізэрным і нязначным.

Ідэйны змест радкоў удала “падсвечваецца” моўнымі асаблівасцямі. Напрыклад, ужыванне метафары “вецер зубамі ляскаў” падкрэслівае агульную няўтульнасць свету, а эпітэт “самотная” ў дачыненні да яблынькі характарызуе яе ўнутраны стан. Эпітэт “былы (сад)” адным словам выяўляе пазіцыю аўтара: грамадства губляе духоўнасць. Шматкроп'е ў канцы радка дае прастор думкам чытача, дае магчымасць выбраць свой шлях вырашэння пытання.

Простыя таленавітыя радкі мяне вельмі ўзрушылі. Думкі аўтара сталі маімі асабістымі. Я лічу, што прыйшоў час, калі чалавек ужо не просіць міласці ў прыроды, а прырода просіць літасці ў нас. Людзі, не кідайце сад на абразу, не губіце сябе!

Пятая частка кранае сваёй лірычнасцю.

● *Чым навеяны мяккі, цёплы настрой?*

Паэт згадвае сваіх бацькоў — светлы, чысты ўспамін: мама — як аблачынка, калыханка, тата — “неспакойны спакой”, бацькоўскі дом, дзе калыханка, дзе вяртанне ў роднае слова, без якога лірычны герой — “сірата сіратою”.

● *Якія сродкі моўнай выразнасці рэалізуюць рамантычны характар паэмы?*

Мама праплывае, як ціхая аблачынка — метафарычнае параўнанне; бацька — спакой, які неспакойна водзіць плячыма — аксюмаран; ужыванне фальклорных элементаў-згадак, забаўлянак, у якіх выяўляецца народная педагогіка.

● *А якія забаўлянкі (кароткія вершаваныя прыгаворы маці, якія па змесце нагадваюць маленькія казачкі) памятаеце вы са свайго дзяцінства?*

У шостай частцы барадулінскае слова “вельмі жывое і вобразнае, гнуткае і паэтычнае”.

● *“Голас паслаць да прасторы ў сваты” — як вы разумееце сэнс гэтых радкоў, што можна сказаць пра іх аўтара?*

Гукнеш — і пачуеш рэальную паэзію, але не кожны здольны яе адчуць і занатаваць у радкі, а толькі чалавек, адкрыты Сусвету і Космасу, творца, які здольны ўбачыць паэзію ў самай простай і звыклай з'яве.

Сёмая частка — прыгожая карціна жывой зімовай прыроды.

● *Як паэт малюе яе вобраз? Якія словы выконваюць ацэначную функцыю?*

Першы снег, маўклівая цішыня, бор грэе ў сняжку азяблыя ногі, завірух белагрывыя коні.

У восьмай частцы як працяг папярэдніх лірычных перажыванняў — згадка пра язычніцкага бога марозу Зюзю. Доўгі час беларусы пакланяліся язычніцкім багам, верылі ў роднасць чалавека і прыроды, ажыўлялі і абагаўлялі расліны і жывёлаў. Пазней на Беларусь прыйшло хрысціянства, але рэшткі старажытнай рэлігіі захаваліся да сёння.

● *Пра якія элементы язычніцкага светаўспрымання беларусаў ідзе гаворка ў гэтым фрагменце паэмы? З якой мэтай яны ўводзяцца ў структуру твора?*

“Вяртанне ў першы снег” — вяртанне да вытокаў, дзе бог Зюзя “са старога мужыцкага роду, трывалы, нібы беларусы ўсе, босы ходзіць у расхрыстаным кажусе”. Згадваюцца і іншыя элементы язычніцкага светаўспрымання беларусаў: звычка абносіць свойскую жывёлу (у тэксце “ружовы з дзірачкамі пятачок”) вакол стала тры разы, каб ручылася, аб засланку церці, каб саланіна тоўстай была.

Аналізуючы ідэйны змест твора і асаблівасці яго паэтычнага выяўлення, прыходзім да высновы, што гэта не проста экскурсія ў родны кут, а твор, у якім вырашаюцца агульначалавечыя праблемы. На думку аўтара, трэба клапаціцца ў жыцці пра вельмі простае і разам з тым складанае — заўсёды заставацца чалавекам: захоўваць духоўнасць, шанаваць бацькоў, родную зямлю, прыроду, людзей, якія знаходзяцца побач. Аўтар — шчыры беларус, які з вялікай сімпатыяй ставіцца да ўсяго роднага, нацыянальнага. Беларускасць твора адчуваецца ва ўсім: любові да сцяжынкі, “бульбяных панчошак”, яблынькі пад акном. Гэта прыгожы крок да шанавання ўсёй Айчыны.

Аўтарская думка звернутая да беларускай духоўнасці, шукаць якую трэба дома, у роднай хаце, на роднай сцяжыне. Таму, як піша Р. Барадулін, “трэба дома бываць часцей”. (Гучыць запіс песні “Трэба дома бываць часцей”.)

● *Звернемся да папярэдне атрыманага задання занатаваць у выглядзе верша думкі, што напрасіліся на паперу пасля прачытання паэмы.*

Чытаюцца вучнёўскія вершы тыпу “Родны кут”, “Я беларус”.

Заключнае слова настаўніка.

Паэма “Вяртанне ў першы снег” адлюстроўвае наша жыццё праз перажыванні. Звычайная тэма раскрываецца незвычайна. Барадулінскаму пяру падуладныя складаныя думкі, выражаныя простым матчыным словам. Першы снег — запамінальны вобраз чысціні і духоўнасці роднага дому, да якога трэба вярнуцца. Ідэйная заглыбленасць, адметнасць стылю, жанру, багацце мовы — усё кандэнсуе твор у адно высокамастацкае цэлае.

***Дамашняе заданне:*** 1. Прачытаць першыя чатыры раздзелы рамана І. Чыгрынава “Плач перапёлкі”. 2. Вызначыць найбольш значныя эпізоды пра пачатковы перыяд вайны.

***Індывідуальныя заданні:*** скласці паведамленні “Псіхалагічная грунтоўнасць вобраза Дзяніса Зазыбы”, “Становішча мірнага насельніцтва ў першыя дні вайны”.